ба адзначыць, што І.Кірчук па-майстэрску валодае як дыяпазонам і тэмбравай палітрай свайго голасу, так і магчымасцямі вялікай колькасці музычных інструментаў (на канцэрце ўвесь час ідзе іх змена). А ёсць кампазіцыі, дзе таленавіты музыкант адначасова спявае і іграе на варгане, што сёння ў традыцыйным народным інструментальным выканаўстве не выкарыстоўваецца.

Такім чынам, працуючы на высокамастацкім, еўрапейскім узроўні, гурт шырока прапагандуе беларускае мастацтва далёка за мяжой і адраджае старадаўнія культурныя традыцыі. Больш таго, яго творчасць выконвае і такую вельмі значную выхаваўчую функцыю, як фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і музычнага густу шырокага кола моладзі, якая складае асноўную слухацкую аўдыторыю.

*А.М.Дзедавец*

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЗІЦЯЧАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Актывізацыя творчай дзейнасці – адзін з галоўных напрамкаў развіцця асобы, менавіта яна дае чалавеку магчымасць праявіць індывідуальнасць і унікальнасць у адносінах да таго, што існуе вакол нас. Зараз у адукацыі адчуваецца супярэчнасць паміж неабходнасцю павышэння творчай актыўнасці кожнага вучня і існуючай практыкай арганізацыі вучэбнай дзейнасці, якая арыентуецца на рэпрадуктыўнае навучанне. У такіх абставінах погляды многіх педагогаў звяртаюцца ў бок музычнага фальклору. Фальклор усё больш усведамляецца грамадствам як самабытны фактар духоўнасці, далучэння да нацыянальнай культуры і гісторыі народа, а развіццю падрастаючага пакалення з дапамогай фальклору надаецца значная ўвага.

“Кожнае дзіця з першых месяцаў жыцця сутыкаецца з калыханкамі, забаўлянкамі, прыгаворкамі, казкамі, а затым, падрастаючы, – з лічылкамі, дражнілкамі, заклічкамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гульнямі. Праз іх яно пазнае навакольны свет, развіваецца фізічна і духоўна, авалодвае роднай мовай, засвойвае навыкі музычнага інтанавання” [2, с.50]. І калі выкарыстоўваць методыкі з прыёмамі развіцця творчай актыўнасці, то народзіцца не толькі музыкант-выканаўца, але і творца.

Арыентацыя на малодшы школьны ўзрост і апора на гульнёвую накіраванасць гэтага ўзросту з’яўляюцца найбольш спрыяльнымі ў развіцці творчых якасцей дзяцей з дапамогай фальклору і ў музычнай, і ў агульнаадукацыйнай школе. У рабоце з малодшымі школьнікамі на музычных занятках пажадана выкарыстоўваць практыкаванні, якія садзейнічаюць песеннай творчасці і актывізацыі творчай дзейнасці.

Да першага тыпу практыкаванняў адносяцца такія, якія дапамагаюць:

– вызначыць, калі скончылася гучанне апошняга гуку мелодыі (утрымліваць яго на педалі);

– пачуць розныя канчаткі дзвюх амаль аднолькавых музычных фраз;

– адрозніваць напрамак руху мелодыі ўверх–уніз.

Да другога тыпу практыкаванняў адносяцца розныя распяванні з заданнямі:

– спяваць малую тэрцыю ўніз (“Ку-ку”) у розных танальнасцях (пасля паказу педагога);

– спяваць гукарад з пяці нот у зыходным руху (таксама ад розных гукаў);

– спяваць малую тэрцыю ўніз (дзеці клічуць: “Коля! Коля!”), затым малую тэрцыю і квінту ўніз – мажорнае трохгучча (адказвае адно дзіця: “Я іду!”);

– спяваць народныя папеўкі і ўрыўкі з іх (“У мяне ў маладзенькай паясочак залаценькі”).

Такія практыкаванні і методыку паэтапнага фарміравання песеннай творчасці, якую мы прыводзім ніжэй, прапаноўвае Г.П.Новікава [3, с. 33–45]. Мы змянілі змест некаторых практыкаванняў, узяўшы за аснову творы беларускага музычнага фальклору.

Першы этап – імправізацыя простых папевак і гукапераймanняў. Задача – фарміраванне ў дзяцей спосабаў імправізацыі простых матываў на склады, якія адпавядаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гукам розных жыццёвых з’яў, перадаюць выразныя інтанацыі.

Творчыя заданні першага этапу заключаюцца ў наступным:

1) пець самастойна, знаходзячы то высокія інтанацыі (спявае маленькая зязюлька, мяўкае кацяня, гаўкае маленькі сабака), то больш нізкія (спявае вялікая зязюля, мяўкае кошка, гаўкае вялікі сабака);

2) імправізаваць папеўку, якая імітуе гучанне жалейкі: беларуская народная песня “Пастушок”;

3) спяваць свае імёны на двух–трох гуках, перадаючы розныя інтанацыі;

4) праводзіць пеўчую пераклічку: “А-у, дзе ты? –Я тут. – Ідзі сюды!”;

5) імправізаваць матыў з двух–трох гукаў на “ля”, другое дзіця прыдумвае свой матыў, дзеці спаборнічаюць, хто больш прыдумае;

6) пераймаць рытмічнае гучанне бубна;

7) завяршыць калыханку, прыдумаць сваю мелодыю на “баю-баю”.

Другі этап – музычныя пытанні і адказы. Педагог задае музычнае пытанне, а дзіця імправізуе музычны адказ. Задача – фарміраваць спосабы імправізацыі (завяршыць мелодыю, якую пачаў дарослы; развіваць пачуццё ладу і музычнай пытальна-адказнай формы).

Творчыя заданні другога этапу наступныя:

1) імправізаваць мелодыю на словы адказу: “Гусі, гусі, дзе ваш дом? “–“Каля рэчкі, пад кустом!”;

2) імправізаваць мелодыю на словы адказу: “У бабкі”, “Ладкі” (беларуская народная прымаўка);

3) сумесная творчасць дзяцей – стварэнне песень на тэк- сты знаёмых вершаў;

4) музычнае лато, дзе дзеці па змесце малюнка на картцы ствараюць песню на зададзены тэкст з аднаго – двух – трох радкоў.

Трэці этап – стварэнне мелодый кантрастнага характару. Задача – фарміраваць спосабы складання дзецьмі простых папевак кантрастнага характару на зададзены тэкст, развіваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачуццё ладу (адчуванне мажору, мінору).Творчыя заданні трэцяга этапу:

1) скласці і спець вясёлую песню на зададзены тэкст;

2) скласці і спець сумную мелодыю на зададзены тэкст;

3) скласці і спець песню, якая складаецца з двух гукарадоў: "А я польку танцавала, і мне полька шанцавала. Я не стала танцаваць, мне не стала шанцаваць".

Успрыманню дзецьмі мелодый кантрастнага характару дапамагае праслухоўванне песень з рознымі мелодыямі і рытмам.

Усе гэтыя практыкаванні можна выконваць на занятках і ў музычнай, і ў агульнаадукацыйнай школе. Але музычны фальклор трэба выкарыстоўваць і ў паўсядзённым жыцці, і на адпачынку, і пры ўдзеле ў народных святах з велізарнай колькасцю гульняў, якія развіваюць творчую фантазію школьнікаў і актывізуюць іх творчую дзейнасць.

Для групавых практыкаванняў на дзеянне з уяўляемымі рэчамі можна ўзяць сюжэт з жартоўнай песні "А ў печы жар, жар" [1, с. 134]. Яе змест нескладаны. Верабей наварыў піва і запрасіў гасцей. Прызначым вучняў на ролі гасцей. Сам Верабей, а з ім Варона, Муха і Камар няхай накрываюць на стол, частуюць гасцей: Жураўля, Чаплю, Чачотку, Сінічку, Саву, Каўку, Сойку, Сароку.

Гульня развівае здольнасці да пераўвасаблення, фантазію, прывучае падпарадкоўваць яе сваёй волі, вызначанаму плану, садзейнічае выхаванню спагадлівасці. Практыкаванне ўскладняецца, калі дзеці будуць спяваць якую-небудзь песню.

Такім чынам, трэба адзначыць, што спецыяльныя заданні, якія складаюцца на аснове музычнага фальклору, стымулююць успрыманне мастацкай вобразнасці песеннай творчасці, дазваляюць лепш арыентавацца ў творчай дзейнасці: падбіраць неабходную меладычную лінію, вызначаць рытмічны бок песні, прымяняць пры выкананні нюансы (моцна, ціха, хутка, працяжна, лёгка і інш.), а таксама развіваць творчую актыўнасць малодшых школьнікаў. Акрамя таго, фарміраванне ў дзяцей песеннай творчасці на матэрыяле музычнага фальклору ўплывае на развіццё ўяўлення, самастойнай дзейнасці, неабходных маральных якасцей:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

добразычлівасці, павагі адзін да аднаго, а таксама музыкальнасці.

1. *Беларускі* фальклор у школе. 2 кл.: Дапам. для настаўніка / Аўт.-уклад. І.І.Сучкоў, Н.І.Шрамава, У.М.Старчан-ка. – Мн.: Беларусь, 2000. – 175 с.

2. *Науменко Г.М.* Фольклорная азбука: Учеб. пособие для начальной школы. – М.: Изд. центр “Академия”, 1996. –136 с.

3. *Новикова Г.П.* Эстетическое воспитание творческой активности детей старшего дошкольного возраста: Метод. рек. для педагогов, воспитателей и муз. руководителей. – М.: АРКТИ, 2002. – 224 с.

*Т.А.Дубоўская*

# БЕЛАРУСКІЯ ТЭАТРАЛЬНЫЯ АМАТАРСКІЯ КАЛЕКТЫВЫ НА АКУПІРАВАНЫХ ЗЕМЛЯХ у 1941–1944 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перыяд нямецкай акупацыі 1941–1944 гг. існаваў і працягваў развівацца беларускі тэатр. Гэты перыяд у гісторыі тэатральнага мастацтва характарызуецца сцвярджэннем сваёй нацыянальнай годнасці. Сцэнічнае мастацтва 1941–1944 гг. мае практычную важнасць для тэатральнага жыцця наогул, паколькі дае новы зрэз і магчымасць асэнсаваць уплыў гістарычных падзей на творчыя і працоўныя масы беларусаў. З восені 1941 г. у Мінску пачаў працаваць Менскі гарадскі беларускі тэатр. Ён складаўся з акцёраў розных прафесійных тэатраў, якія па тых ці іншых прычынах аказаліся ў горадзе. Але тэатральнае жыццё не абмяжоўвалася толькі дзейнасцю гэтага калектыву. Акупацыйныя ўлады выдалі дазвол на арганізацыю мясцовых (на раённым узроўні) культурных таварыстваў і народных дамоў, пры якіх было створана некалькі аматарскіх тэатраў.

Правядзём агляд дзейнасці драматычных калектываў на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, а таксама на тых землях, дзе гуртаваліся беларусы.

*Мінск.* У 1943 г. у Мінску арганізаваліся дзве групы,